УДК 821.161.3-31.09«20»

***Г.В. Навасельцава***
*канд. філал. навук, дац. каф. літаратуры*
*Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава*
e-mail: Novoseltseva.anna@mail.ru

# ФІЛАСОФСКІ РАМАН У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ «ПАЛЫНОВЫ ВЕЦЕР» ЛЕАНІДА ЛЕВАНОВІЧА І «НА МЯЖЫ ЦЯРПЕННЯ» УЛАДЗІМІРА ДАМАШЭВІЧА)

*У сучаснай беларускай літаратуры прадстаўлены мастацкія прыклады філасофскага рамана, у якім закранаецца знакавая маральна-этычная праблематыка, прасочваецца аўтарскае асэнсаванне выказанай ідэі на розных узроўнях твора, сацыяльна-псіхалагічны змест рэпрэзентуецца ў агульначалавечым кантэксце. Леанід Левановіч асэнсоўвае наступствы Чарнобыльскай катастрофы, значныя грамадскія зрухі, якія разглядае ў гуманістычным рэчышчы, найперш, праз духоўныя пошукі асобы, звязвае з жыццёвым шляхам чалавека. Уладзімір Дамашэвіч звяртаецца да праблемы «маленькага чалавека», імкнецца прасачыць трагедыйнасць асобных момантаў жыцця ў тыповых сацыяльных абставінах, паказаць складанасць узаемастасункаў чалавека і грамадства.*

Вартасць даследавання твораў беларускай літаратуры ў жанры рамана выклікана неабходнасцю сістэматызацыі навуковых уяўленняў, распрацоўкі цэласнай тэарэтычнай жанравай мадэлі і выяўлення эстэтычнага статусу рамана ў сучаснай беларускай прозе. Традыцыйна раман разумеецца як адзін з відаў эпічнай апавядальнай літаратуры, а да мастацкіх з’яў гэтага жанру адносяць творы, у якіх адлюстраваны складаны грамадскі працэс, значнае кола жыццёвых з’яў, што паказаны ў развіцці.

Даследчыкі і пісьменнікі звяртаюць увагу на сацыяльную скіраванасць жанру, адзначаючы спецыфіку пазіцыі аўтара, функцыі чытача, асобасны характар выяўлення сацыяльнай праблематыкі. Эпічнае паходжанне жанру абумоўлівае неабходнасць адлюстравання паўнавартаснага маштабнага малюнка навакольнай рэчаіснасці, які разам з тым інтэрпрэтуецца аўтарам праз індывідуальнае ўспрыманне і ацэнку галоўным героем. Менавіта «адзначаная дваіснасць, супярэчлівасць надае раману той безупынны рух, які перш за ўсё заўважаецца ўсімі даследчыкамі жанру. І ў гэтым руху раман з максімальнай дакладнасцю ўвасабляе сам свет, само грамадства, самога чалавека, адначасова ўзнаўляючы і мадэлюючы іх, ацэньваючы і творачы» [1, с. 21].

У сучаснай беларускай літаратуры грамадства і чалавек актыўна рэпрэзентуюцца ў рамане-антыўтопіі і філасофскім рамане, якія выступаюць запатрабаванымі пісьменнікамі жанравымі формамі, дзе адбываецца апрабацыя наватарскіх мастацкіх сродкаў. Адметнасць філасофскага рамана на ўзроўні паэтычных сродкаў выяўляецца не толькі праз эмацыйныя дыялогі герояў, але і праз унутраныя маналогі, аўтарскія ўмаўчанні, рознага роду асацыятыўныя сувязі, а на ідэйна-зместавым узроўні – праз дынамічны псіхалагічны аповед. Адзначанае вышэй абумоўлівае мэту даследавання – ахарактарызаваць жанрава-стылёвую спецыфіку філасофскага рамана ў сучаснай беларускай літаратуры на прыкладзе твораў «Палыновы вецер» (2002–2008 гг.) Леаніда Левановіча і «На мяжы цярпення» (2006 г.) Уладзіміра Дамашэвіча.

Сюжэтная аснова філасофскага рамана – гэта мастацкая праверка выказаных галоўным героем маральна-этычных прынцыпаў, жыццёвых законаў, агульначалавечых поглядаў на свет. З гэтай мэтай, як сцвярджае У.В. Агеносаў, аўтар канцэнтруе падзеі, пазбягае другасных дэталяў і стварае часам надзвычайныя сітуацыі, што дазваляе змадэліраваць палажэнні, у якіх выказаныя ідэі дасягаюць свайго найвышэйшага ўвасаблення.

Жанраўтваральнай спецыфікай філасофскага рамана выступае мастацкае адлюстраванне субстанцыяльнай ідэі на ўсіх ўзроўнях твора (сюжэта, сістэмы вобразаў, кампазіцыі, прасторава-часавых катэгорый). Філасофскі раман вызначаецца спецыфічнай суб'ектнай арганізацыяй: асноўныя героі «дубліруюцца» ў нейкай ступені іншымі персанажамі. Як працягвае даследчык, «гэта дазваляе пісьменніку стварыць персаніфікаваную сістэму адценняў асэнсаванай ідэі, перадаць дыялектыку і складанасць думкі, падкрэсліць універсальнасць ідэі» [2, с. 10].

У цэлым філасофскі раман актыўна выкарыстоўвае інтэртэкстуальнасць, у прыватнасці, міф або прытчу, што дазваляе пісьменніку ўтрымліваць мастацкі аповед у агульнафіласофскім рэчышчы. Літаратурна-гістарычная рэмінісцэнцыя, сімвал, утопія (або антыўтопія) узмацняюць філасофскую плынь у творы. Адметную ролю ў філасофскім рамане адыгрываюць і прасторава-часавыя катэгорыі. У.В. Агеносаў слушна заўважае, што раманам гэтай жанравай разнавіднасці ўласцівы так званы «вертыкальны час»: мастацкае дзеянне адбываецца ў розных часавых вымярэннях, аднак дзякуючы аўтарскай сістэме метафар, увядзенню ў твор міфалагічных матываў і вобразаў гэта ўспрымаецца чытачом як адзіны цэласны час, а героі такім чынам становяцца ўдзельнікамі ўсеагульнай гісторыі. Апісаныя ў творы падзеі набываюць у выніку агульначалавечы змест, праз які і раскрываецца філасофія аўтара.

Мастацкі псіхалагізм, іншасказальнасць збліжаюць філасофскі раман з раманам-утопіяй (раманам-антыўтопіяй), які на ідэйна-мастацкім узроўні распрацоўвае маральна-этычную і маральна-філасофскую праблематыку. І раман-антыўтопія, і філасофскі раман тыпалагічна блізкія паводле спецыфічнага ўвасаблення мастацкага часу, выяўлення адметнай тэмпаральнай арганізацыі на сюжэтным узроўні, хоць раману-антыўтопіі найперш уласціва асэнсаванне філасофскай катэгорыі будучага.

Глыбокай філасофскай праблематыкай вызначаецца раман «Палыновы вецер» Леаніда Левановіча, які завяршае цыкл раманаў «Шчыглы», «Паводка сярод зімы», «Дзікая ружа», «Сіняе лета», «Бесядзь цячэ ў акіян». У цэлым у названых творах «бачацца рысы станаўлення новага беларускага рамана, арыентаванага на сацыяльна дзейны сінтэз нацыянальнага і агульнаеўрапейскага духоўнага вопыту» [3, с. 571]. Пісьменнік паказвае сваіх герояў неад'емна ад значных сацыяльных і гістарычных варункаў, асэнсоўвае грамадскі вопыт праз індывідуальнае бачанне свету, у чым і выяўляецца традыцыйная эпічнасць раманных тэкстаў. Філасофская плынь аповеду, заяўленая яшчэ ў рамане «Шчыглы» як роздум над духоўнасцю адарванага ад спрадвечных традыцый пакалення, відавочна ўзмацняецца ў апошнім рамане, які прысвечаны асэнсаванню Чарнобыльскай катастрофы.

На ідэйна-мастацкім узроўні аўтарам раскрываецца сімвал палыновага ветру: «Над сцішанаю заснежанаю прастораю, над вершалінамі старадрэвін імчаў пругкі марозлівы зюйд-ост – вецер з Чарнобыля. У яго калючым дыханні адчуваўся невынішчальны водар выпетранага, прамерзлага палыну. Палыновы вецер не ведаў спакою і спачыну нават у навагоднюю ноч» [4, с. 221]. Вобраз-сімвал ветру ў рамане шматаблічны: ён ўвасабляе не толькі смяротны подых радыяцыі, але і веру пісьменніка ў невычэрпныя чалавечыя сілы, спадзяванне на тое, што чалавек можа перамагчы нават Чарнобыльскую катастрофу. Палыновы вецер асацыятыўна супастаўляецца з вялікім гістарычным зрухам – разбурэннем СССР – і паказваецца аўтарам як персаніфікаванае ўвасабленне грамадска-сацыяльных змен: «А калі Ты, Палыновы вецер, залятаеш у хату, то заклікаеш да абнаўлення. Ты рушыш усё, што састарэла, згніло і аджыло свой век. А сам Ты, Вецер, нідзе не нараджаешся і нідзе ніколі не паміраеш, бо Ты вечны. Як вечная наша Зямля-Матухна. І на ёй Чалавек» [4, с. 222]. Такім чынам раскрываецца фі-ласофія пісьменніка: дзеля таго, каб захаваць сваю зямлю і найперш самога сябе, трэба звярнуцца да вытокаў духоўнасці, якіх па-свойму шукае кожны з герояў рамана.

У радыяцыйнай зоне апынулася вёска Хатынічы, дзе засталіся жыць, не захацеўшы перасяляцца, пенсіянеры: напрыклад, былы ўчастковы Бравусаў і былы настаўнік Мамута. Героі падобныя найперш агульнасцю лёсаў: яны асэнсоўваюць мінулае і новыя акалічнасці, як прыродныя, так і сацыяльныя, разумеюць, што пасля вайны напалову спаленая вёска адрадзілася, а пасля Чарнобыля, на жаль, не ўваскрэсне. Аднак яны імкнуцца пераканаць іншых, а найперш, саміх сябе, што можна жыць і ў зоне да пятнаццаці кюры, і не існаваць ці выжываць, а жыць паўнакроўна, радавацца сямейнаму шчасцю, захапляцца прыгажосцю прыроды, дбаць, як і раней, пра гаспадарку.

Жыццёвыя змены выяўляюць светапогляд прадстаўнікоў старэйшага пакалення, іх стаўленне да новых грамадскіх ідэй. Гэта пакаленне, якое слаба ведае гісторыю роднай Беларусі, як кажа пісьменнік, іх карані былі падрэзаны партыйнай ідэалогіяй, якая гісторыю Беларусі пачынала з Вялікага Кастрычніка, а да гэтага перыяду, як афіцыйна сцвярджалася, былі адно непісьменнасць і галеча. Так, настаўнік-гісторык Мамута лічыў сябе патрыётам Беларусі, аднак незалежнасць успрымаў як нешта неабавязковае: «Ён быў дзіцем Савецкага Саюза, вучыўся ў савецкай школе, савецкім інстытуце. Слаўную гісторыю Вялікага Княства Літоўскага ён пачаў адкрываць толькі зараз з публікацый пра “Пагоню” і бел-чырвона-белы сцяг. І часам яму рабілася сорамна: як слаба, павярхоўна выкладаў ён гісторыю роднай Беларусі» [4, с. 205].

Калі Пётр Мамута гатовы прыняць незалежную Беларусь, то Бравусаў да гэтага ставіцца з вялікай насцярогай і недаверам. Былы камандзір партызанскага ўзвода, чалавек смелы і рашучы, ён паказаны аўтарам не без недахопаў, у тым ліку ў святле далёка не лепшых маральна-этычных учынкаў. Калі Пётр Мамута ўвасабляе вясковую інтэлігенцыю, то Уладзімір Бравусаў паказаны як шчыры прыхільнік, а таксама абаронца мясцовай улады, савецкай улады ў цэлым, а таму заканамерна, што ён супраць падзелу Савецкага Саюза. На працягу твора аўтар прасочвае, як герой імкнецца пераадолець значныя стэрэатыпы савецкага мыслення, знайсці пазітыўныя факты ў новай грамадскай рэчаіснасці.

Леанід Левановіч стварае шэраг персанажаў і сярэдняга пакалення, кожны з якіх асэнсоўвае той ці іншы зрэз пэўных грамадска-сацыяльных абставін. Значная мастацкая ўвага нададзена вобразу партыйнага чыноўніка, як гаворыць аўтар, партыйнага функцыянера – Андрэя Сахуты, сакратара абкама партыі па ідэалогіі. Вачыма свайго героя аўтар паказвае, наколькі партыя адышла ад народнага жыцця, стала своеасаблівай сістэмай у дзяржаўнай сістэме, сродкам кар’ернага росту для карыслівых людзей. Сахута не прымае гарбачоўскай перабудовы, новага дэмакратычнага мыслення, ён, «як і большасць ягоных дружбакоў-партакратаў, лічыў, што гэта ўсё робіцца на шкоду партыі і народа, але партыйная дысцыпліна, нібы жалезная аброць, прымушала трымацца баразны, па якой вялі вышэйшыя лідары» [4, с. 28]. Яны не толькі кіравалі, але і бязлітасна тузалі, усё ж вымушаны прызнацца герой самому сабе. Пасля распаду Савецкага Саюза Андрэй Сахута, як і многія іншыя чыноўнікі, застаецца без працы, паколькі новую знайсці аказалася няпроста. Разам з тым пісьменнік не паказвае яго няздольным прымаць змены або рашуча дзейнічаць: Сахута вяртаецца на малую радзіму – у радыяцыйную зону, працуе ў лясніцтве, тады як усе іншыя імкнуцца пакінуць небяспечны для здароўя край. Гэты ўчынак дабратворна ўплывае на самога Сахуту: «Нібы ўкапаны стаяў Андрэй каля выгану, па якім лётаў басаногім хлапчуком. Цяпер прыглядаўся да ўчарнелай някошанай травы, выпетралага бадылля крываўніку, учэпістых кустоў чорнага палыну. Яму падалося, што ніколі раней не дакопваўся так блізка да разгадкі таямніц навейшай гісторыі чалавецтва» [4, с. 121]. Разам з тым Андрэй пакрыўджаны на ўвесь свет за тое, што скончылася яго кар’ера, яму невыносныя спачуванні знаёмых, якія бачаць яго цяперашняе незайздроснае становішча, ён не можа вызначыць для сябе і пэўныя жыццёвыя прыярытэты. Нездарма аб рамане «Палыновы вецер» А.У. Рагуля

зазначае, што твор «з’яўляецца своеасаблівым разгорнутым сімвалам – падсумаваннем вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва, сэнс якога А. Платонаў азначыў канцэптам ***катлаван*** у сваім аднайменным рамане. У «Палыновым ветры» Л. Левановіч часта звяртаецца да рэтраспектыўнага паказу сацыяльнай і духоўнай рэальнасці на пачатку вялікага сацыяльнага эксперымента, калі толькі рыхтаваўся катлаван пад фундамент сталінскага сацыялізму. Даўно перажытае вяртаецца аўтарам у кантэкст актуальнага часу, становіцца аб’ектам рэфлексіі. Гэтым самым у творы рэабілітуецца сучаснасць, занядбаная дзеля “светлай” будучыні, аднаўляецца плынь гісторыі» [3, с. 566].

Сістэма персанажаў у рамане арганізавана такім чынам, каб раскрыць розныя інтэрпрэтацыі філасофскіх поглядаў аўтара. У прыватнасці, прадстаўніком лепшай часткі нацыянальнай інтэлегенцыі выступае Пятро Махавікоў – ідэйны апанент і адначасова сябра Андрэя Сахуты. Пятро добра ведае беларускую мову, свядома вітае дэмакратычныя пераўтварэнні ў грамадстве і пераходзіць працаваць у выдавецтва, дзе займаецца беларускімі кнігамі. Паказваючы розныя вобразы жыхароў або выхадцаў з вёскі Хатынічы, Л. Левановіч імкнецца стварыць мікрасвет беларускага грамадства, выявіць найбольш значныя тыпы яго прадстаўнікоў, раскрыць іх светапогляд, параўнаць жыццёвую філасофію.

Калі Леанід Левановіч імкнецца асэнсаваць тыповыя жыццёвыя праявы ва ўмовах надзвычайных, то Уладзімір Дамашэвіч у рамане «На мяжы цярпення» раскрывае складаныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі на сацыяльна-бытавым узроўні. Галоўны герой – Алесь Рамейка, сталага веку чалавек, ціхмяны і памяркоўны, добры сем’янін, літаратурны рэдактар па прафесіі, жыве звычайным жыццём, хоць і адчувае яго эмацыйную спустошанасць. Ён разам з жонкай Марынай выхаваў дзвюх дачок, ніколі не імкнуўся да вялікага дабрабыту, прытрымліваўся сялянскай мудрасці пра тое, што чалавек павінен найперш заставацца сумленным. Асэнсоўваючы ўжо пройдзеную значную частку жыццёвага шляху, Рамейка вымушаны прызнацца, што, хоць і лічыў сябе шчаслівым, гэта была ўсяго толькі ілюзія. Усведамленне гэтага прыводзіць героя да адчування нязначнасці ўласнага жыцця, якое пазбаўляецца сэнсу. Паступова выспявае канфлікт паміж Рамейкам і яго жонкай, сям’ёй, раднёй, што інтэрпрэтуецца пісьменнікам у рэчышчы і псіхалагічным, і філасофскім, у выніку чаго раман выходзіць за межы сацыяльна-бытавой прозы, выяўляе мастацкую поліфанічнасць.

У адрозненне ад Леаніда Левановіча Уладзімір Дамашэвіч правярае маральна-этычныя прынцыпы свайго героя не ў складаных сацыяльных варунках, не ва ўмовах цяжкіх тэхнагенных катастроф, а ў паўсядзённым жыцці тыповага «маленькага» чалавека, які, аднак, даходзіць да мяжы свайго цярпення, што і заяўлена ў назве рамана.

Няпроста складваюцца ў Алеся адносіны з жонкай. Адсутнасць даверу і паразумення даводзіць героя да роспачы, штурхае на неабдуманыя ўчынкі. Аўтар прасочвае, як да Рамейкі паступова прыходзіць разуменне, што ў яго сэрцы не будзе Марыны: «Ён прымаў яе дагэтуль як свайго, блізкага чалавека, аказалася, што яна была не такой, якою ён яе бачыў, ведаў; аказалася, што і яна ўспрымала яго не такім, якім ён быў напраўду, лічыла яго ворагам, здраднікам. Чаго больш хацець? Цяпер ён такі, якім яна лічыла яго дзесяць і больш гадоў, цяпер яна можа сказаць, што кажа праўду. Хай ён ёй здрадзіў, але толькі таму, што яна здрадзіла яму першая: адраклася ад яго – сумленнага, чыстага і ні ў чым не вінаватага перад ёю. Калі б яна больш верыла яму, мо не зрабіла б такога, тады не пайшоў бы і ён на крывую дарогу. А так – яны цяпер квіты» [5, с. 63–64]. Алесь Рамейка верыць і спадзяецца на асабістае шчасце, хоць яго здрада жонцы і спарадзіла трагедыю: каханая, якая спадзявалася застацца з ім, урэшце кінутая Алесем дзеля сваёй сям’і, скончыла жыццё самагубствам. Праз нейкі час галоўны герой перажывае больш моцнае пачуццё, калі сустракае сваю зямлячку, Ларысу Ланеўскую, у якую ён некалі па-юначы быў закаханы. Вобразы Алеся і Ларысы пісьменнік малюе як шмат

у чым падобныя. Ларыса, якая адна выгадавала двух сыноў, як і Рамейка, пазбаўлена асабістага шчасця. Героі асацыятыўна супастаўляюць сябе сённяшніх і ранейшых, спрабуюць асэнсаваць памылкі свайго юнацтва, вярнуць страчаны час: у мінулым Ларыса баялася прызнацца, што каханне Алеся было ўзаемным, нялёгка гэта зрабіць і цяпер, калі нечакана з'яўляецца другі шанц.

Уладзімір Дамашэвіч па-мастацку пераканаўча прасочвае, што і роднасным душам, якія ўрэшце знайшлі адна адну, няпроста зблізіцца. Алесь усё ж рашаецца кінуць сям'ю, дзяцей, якія не разумеюць учынак бацькі, балюча перажывае развод з жонкай, а яшчэ стараецца спадабацца новай сям'і, якая не спяшаецца яго прымаць. У гэтых абставінах аўтар паказвае псіхалагічны партрэт асобы, якая знаходзіцца на мяжы маральных мажлівасцяў чалавечага цярпення і выяўляецца пісьменнікам неадназначна. Герою, які ўсё ж займеў асабістае шчасце, не так і лёгка яго ўтрымаць: раптоўна памірае былая жонка Марына. Ён зноў перажывае страту, імкнецца падтрымаць дзяцей, якія не жадаюць прымаць Алеся як бацьку, а сваякі яго адкрыта вінавацяць.

Чалавечыя ўзаемаадносіны і звязаныя з імі асабістыя трагедыі пісьменнік імкнецца ўключыць у агульнабыццёвы кантэкст: сцвярджае, што ў кожнага чалавека і нават народа ёсць нейкі важны пункт адліку, «нейкая мяжа, нейкая печка, ад якое ён пачынае свае скокі. Звычайна гэта землятрусы, патопы, войны, якія пакідаюць на зямлі і ў свядомасці людзей глыбокія ці менш глыбокія змены, бо, як правіла, не абыходзяцца без ахвяраў» [6, с. 71]. Прыкладам гэтага, працягвае далей пісьменнік, можа стаць любы чалавек, які асэнсоўвае падзеі з уласнага жыцця неад'емна ад грамадскага, гаворыць пра тое, што ў яго жыцці «было да вайны» або «пасля вайны», маючы на ўвазе Вялікую Айчынную. Для Рамейкі «яго "хатняя вайна" стала тым пунктам адліку, які ў яго памяці і свядомасці застанецца да канца, пакуль ён жывы» [6, с. 72]. І чым большы адрэзак часу аддзяляе героя ад трагічнай даты, тым больш ён усведамляе страту, асэнсоўвае яе ва ўсіх праявах, хоць і вяртаецца паступова да звыклага жыццёвага ладу. У цэлым мастацкі аповед вылучаецца інтэлектуальнай напружанасцю, аўтарскай устаноўкай на вобразнае абагульненне, выяўленнем значных маральна-этычных праблем, мастацкім паказам розных варыянтаў іх вырашэння.

Як паказвае мастацкая практыка ў цэлым, сучасны раман выяўляе эстэтычную тэндэнцыю да лаканізму, аўтарскага адмаўлення ад апісальнасці і апавядальнасці, да ўзмацнення ролі псіхалагічнай дэталі, што заглыбляе філасафічнасць твора. Разам з тым найперш філасофскі раман увасабляе аўтарскую інтэрпрэтацыю значнай маральна-этычнай ідэі. Пісьменнік на ідэйна-мастацкім узроўні фармулюе тэзіс, які паслядоўна асэнсоўвае на працягу ўсяго твора.

Леанід Левановіч сцвярджае, што ні грамадская, ні тэхнагенная катастрофа не можа адарваць чалавека ад яго малой радзімы, з якой пачынаецца Радзіма ў цэлым. Уладзімір Дамашэвіч пераконвае чытача, што чалавек мае права і можа стаць шчаслівым, хоць з пошукаў шчасця і пачынаюцца яго пакуты, памылкі, страты, стрываць якія яшчэ павінна хапіць цярпення. Леанід Левановіч з тым або іншым выбраным персанажам звязвае асобны аспект тэмы, раскрывае адметную вобразную сістэму. Уладзімір Дамашэвіч выяўляе мастацкую праверку сваёй ідэі найперш праз асобу галоўнага героя, прадстаўляе яго розныя ўчынкі як аргументы і контраргументы адносна жыццёвага крэда. У выніку сацыяльна-псіхалагічны змест пластычна працягваецца быццёвым, філасофская праблематыка ў раманах выступае спецыфічным аб'ектам мастацкага мыслення, дазваляе паглыблена раскрыць светапогляд пісьменніка.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Затонский, Д. В. Искусство романа и XX век / Д. В. Затонский ; ред. С. Лейбович. – М. : Худ. лит., 1973. – 535 с.

2. Агеносов, В. В. Советский философский роман. Генезис. Проблематика и типология : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.01.02 / В. В. Агеносов ; Моск. гос. пед. ин-т им. В. И. Ленина. – М., 1988. – 32 с.

3. Рагуля, А. У. Леанід Леановіч / А. У. Рагуля // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр дослед. беларус. культуры мовы і літ. ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – Т. 4, кн. 3. – С. 544–571.

4. Леванові ч, Л. Палыновы вецер : раман / Л. Левановіч. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2009. – 224 с.

5. Дамашэвіч, У. На мяжы цярпення / У. Дамашэвіч // Полымя. – 2007. – № 4. – С. 3–74.

6. Дамашэвіч, У. На мяжы цярпення / У. Дамашэвіч // Полымя. – 2007. – № 7. – С. 48–78.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 16.10.2016

***Navaseltsava G.V.* Philosophical Novel in Modern Belarussian Literature (on the Novels «Wormwood Wind» by Leanid Levanovich and «On the Patience Line» by Uladzimir Damashevich)**

*There are some examples of a philosophical novel in the contemporary Belarussian literature. In these novels the author touches significant moral and ethical problems, shows his own fictional interpretation on various novel levels, the social and psychological plan mixes with the universal one. Leanid Levanovich thinks about the consequences of Chernobyl disaster, important social changes, which are observed in a philosophical sense through the person's spiritual search and shows the context of a personal pilgrimage. Vladimir Damashevich turns to the problem of «a small man», tries to explain the tragedy of some moments in our life in a typical social atmosphere, and shows difficult relationships between the person and the society.*